Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
БДУКМ
______________ С. Л. Шпарло
«____» _____________ 2021 г.
Рэгістрацыйны № ВД-____ / вуч.

# БІБЛІЯТЭЧНАЯ ПРАФЕСІЯЛОГІЯ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па спецыяльнасці II ступені вышэйшай адукацыі*
*1-23 80 01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць.*
*Прафілізацыя: Тэорыя і методыка навукова-даследчай іаналітычнай дзейнасці*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2021

Вучэбная праграма распрацавана на аснове тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці II ступені вышэйшай адукацыі 1-23 80 01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць. Рэгістрацыйны нумар Е 23-2-001 / пр-тып ад 21.03.2019

**СКЛАДАЛЬНІК**

*А. Ю. Казленка*, дацэнт кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*А. Э. Паліцэвіч*, старшы выкладчык кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук;

*А. М. Фёдарава,* дацэнт кафедры педагогікі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай*бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол №9 ад 27.05.2019);

*прэзідыумам*навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 10.06.2020)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч

Адказны за выпуск: А. Ю. Казленка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У сучасны момант бібліятэчная прафесія перажывае сур’ёзныя змены,адбываецца тэхналагізацыя асобных напрамкаў бібліятэчнай работы, пры гэтым захоўваецца гуманітарны характар дзейнасці бібліятэчнага спецыяліста. Недастатковае разуменне спецыфікі сучаснай бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці і сутнасці бібліятэчнай прафесіі, неадназначныя адносіны да бібліятэкі як сацыяльнага інстытута грамадстваназіраюцца як сярод рэальных і патэнцыяльных карыстальнікаў, так і сярод работнікаў бібліятэк. У гэтай сувязі для бібліятэчнага спецыяліста вельмі важна разумець сацыяльнае прызначэнне бібліятэкі і бібліятэкара ў інфармацыйным грамадстве,умець вызначаць перспектыўныя напрамкі развіцця прафесіі і асобы спецыяліста. Таму набыццё магістрантамі прафесійных кампетэнцый убібліятэчнай прафесіялогіі набывае актуальнае значэнне.

*Мэтай* выкладання вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчная прафесіялогія» з’яўляецца засваенне магістрантамі сістэмы ведаў аб асаблівасцях бібліятэчнай прафесійнай дзейнасці ва ўмовах інфарматызацыі грамадства і вызначэнне існуючых і перспектыўных напрамкаў развіцця спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы.

Дасягненне гэтай мэты рэалізуецца праз вырашэнне наступных *задач*:

– азнаямленне з тэарэтычнымі падставамі бібліятэчнай прафесіялогіі як навукі і вучэбнай дысцыпліны, сучаснымі пазіцыямі бібліятэчна-інфармацыйнага спецыяліста ў прафесійнай структуры грамадства;

– фарміраванне ўстойлівых ведаў аб эвалюцыі зместу і форм бібліятэчнай дзейнасці як прафесіі, характарыстыках сучаснай прафесійнай дзейнасці і прафесійных патрабаваннях да асобыспецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы, перспектывах развіцця бібліятэчнай прафесіі;

– засваенне значнасці прафесійнага развіцця спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы;

– выпрацоўка ўменняў і навыкаў прымянення тэарэтычных і метадычных ведаў па бібліятэчнай прафесіялогіі ў вучэбнай і прафесійнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбная дысцыпліна«Бібліятэчная прафесіялогія» структуравана па тэмах, якія ўяўляюць сабой адносна самастойныя ўзбуйненыя дыдактычныя адзінкі зместу навучання. Змест тэм абапіраецца і спалучаецца з набытымі магістрантамі ведамі і ўменнямі пры вывучэнні вучэбных дысцыплін агульнанавуковага, агульнапрафесійнага і спецыяльнага цыкла першай ступені адукацыі, а таксама вучэбнай дысцыпліны другой ступені адукацыі «Тэарэтыка-метадалагічныя праблемы бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства». Вучэбная дысцыпліна «Бібліятэчная прафесіялогія»падсумоўвае веды магістрантаў аб сутнасці і змесце прафесійнай дзейнасці бібліятэчна-інфармацыйнага спецыяліста.

Асноўнай кампетэнцыяй, фарміраванне якой прадугледжана зместам вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчная прафесіялогія», з'яўляецца валодаць ведамі аб прафесіялагічных канцэпцыях, метадах прафесіялогіі, быць здольным распрацоўваць на навуковай аснове патрабаванні да кампетэнцый спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйных устаноў.

Акрамя таго, значнымі з'яўляюцца наступныя кампетэнцыі:

Быць здольным да даследавання бібліятэчнай прафесіі ў кантэксце сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства.

Умець улічваць сацыяльныя і маральна-этычныя нормы ў асобаснай і сацыяльна-прафесійнай жыццядзейнасці.

Клапаціцца аб высокім грамадскім статусе сваёй прафесіі.

Быць здольным на працягу жыцця самастойна забяспечваць асобаснае і прафесійнае самаразвіццё.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчная прафесіялогія» магістрант павінен *ведаць*:

– змест базавых паняццяў дысцыпліны па выбары«Бібліятэчная прафесіялогія»;

– тэарэтыка-метадалагічныя падставы бібліятэчнай прафесіялогіі, асноўныя этапы яе развіцця як навукі і вучэбнай дысцыпліны;

– эвалюцыю бібліятэчнай прафесіі ў гістарычным аспекце;

– асноўныя характарыстыкі прафесійнай дзейнасці сучаснага спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы, яе структурныя і сістэмныя асаблівасці, прафесійныя патрабаванні да асобы спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы;

– змест, напрамкі і асноўныя формы прафесіяналізацыі спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*умець:*

– аналізаваць уплыў навуковых, сацыяльна-эканамічных, палітычных, культурных і інфармацыйна-камунікацыйных працэсаў на становішча і задачы бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці;

– аналізаваць дынаміку і перспектывы развіцця бібліятэчнай прафесіі і яе спецыяльнасцей;

– праводзіць аналіз прафесійнай кампетэнтнасці спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы і распрацоўваць патрабаванні да кампетэнцый спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйных устаноў;

– распрацоўваць праграмы прафесіяналізацыі спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы;

– аналізаваць бібліятэчную прафесію і яе спецыяльнасці з дапамогайметадаў і прыёмаў прыкладной прафесіялогіі;

*валодаць:*

– базавымі методыкамі аналізу прафесійнай дзейнасці ў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы;

– навыкамі прымянення тэарэтычных і метадычных ведаў па бібліятэчнай прафесіялогіі ўвучэбнай дзейнасці, дзейнасці па кіраванні персаналам бібліятэчна-інфармацыйных устаноў, прафесіяналізацыі кадраў бібліятэчна-інфармацыйных устаноў, прафарыентацыйнай дзейнасці бібліятэчна-інфармацыйных і адукацыйных устаноў, у асабістым прафесійным развіцці і інш.

Спецыфіка выкладання вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчная прафесіялогія» шмат у чым абумоўлена характарам прафесійнай дзейнасці бібліятэчна-інфармацыйнага спецыяліста. У авалоданні дысцыплінай ляжаць чатыры канцэптуальныя ўзроўні: веды, метады, мэты, каштоўнасці.

Веды і метады – гэта раскрыццё зыходных паняццяў, прадпісанняў аб мэтах і спосабах дзейнасці. Гэтым складнікам адукацыйнага цыкла адпавядаюць тэмы 1 і 6, у якіх апісваецца сутнасць бібліятэчнай прафесіялогіі як навукі і вучэбнай дысцыпліны, аналізуецца навукова-метадычнае забеспячэнне прыкладной прафесіялогіі.

Мэты – гэта жаданыя вынікі, якія спецыяліст апярэджвае, зыходзячы са свайго разумення сутнасці культуры, сваёй прафесіі, перажывання сённяшняй сацыякультурнай сітуацыі. Дадзены ўзровень забяспечваецца матэрыяламі тэм 2 і 3, дзе аналізуюцца гістарычныя змены зместу і форм бібліятэчнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці як прафесіі, даюцца характарыстыкі прафесійнай дзейнасці сучаснага спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы.

Каштоўнасці – гэта этыка і філасофія спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Каштоўнасці выказваюць стаўленне суб'екта да аб'екта – бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Тэмы 4 і 5 адпавядаюць пазначанаму кантэксту і раскрываюць прафесійныя патрабаванні да асобы спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы і сутнасць яго прафесіяналізацыі як індывідуалізаванага, шматступеннага працэсу, які ўключае ўсведамленне прафесійнай місіі дасягненне прафесіяналізму.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчная прафесіялогія» прадугледжана 94 гадзіны, з іх 34– аўдыторныя гадзіны (лекцыі складаюць 14 гадзін, практычныя – 14 гадзін, семінарскія заняткі – 6 гадзін).

Рэкамендаванай формай кантролю з'яўляецца залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Прадмет, змест і задачы вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчная прафесіялогія». Яе месца ў сістэме падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў. Кампетэнцыі, якія фарміруюцца ў магістрантаў падчас вывучэння вучэбнай дысцыпліны. Тэарэтыка-практычная накіраванасць вучэбнай дысцыпліны, яе ўзаемасувязь з цыклам агульнанавуковых, агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін першай і другой ступені адукацыі. Асноўныя віды вучэбных заняткаў і арганізацыя самастойнай работы магістрантаў. Формы кантролю. Характарыстыка забяспечанасці вучэбнай дысцыпліны вучэбнай, метадычнай і навуковай літаратурай.

## *Тэма 1. Бібліятэчная прафесіялогія як навука і вучэбная дысцыпліна*

Прафесіялогія як навуковая дысцыпліна. Падыходы да феномена «прафесія», сацыяльныя прыкметы прафесіі. Метадалагічная спецыфіка інтэрпрэтацыі бібліятэчнай прафесіі і бібліятэчнай прафесіялогіі ў сучаснай сістэме сацыяльных і гуманітарных навук. Аб’ект і прадмет бібліятэчнай прафесіялогіі. Мэта і задачы бібліятэчнай прафесіялогіі. Асноўныя паняцці і тэрміны бібліятэчнай прафесіялогіі.

Эвалюцыя бібліятэчнай прафесіялогіі як навукі. Падыходы А. І. Капцерава, А. С. Чачко, А. В. Сакалова і інш.Комплексныя даследаванні бібліятэчнай прафесіі. Вывучэнне пытанняў бібліятэчнай прафесіялогіі ў Беларусі.Станаўленне і развіццё бібліятэчнай прафесіялогіі як вучэбнай дысцыпліны (А. І. Капцераў, А. С. Чачко, А. А. Каракоз і інш.).

Падыходы да вывучэння бібліятэчнай прафесіі: гісторыка-бібліятэказнаўчых даследаванняў, дзейнасны, працэсны, рэсурсны, кампетэнтнасны, сацыяфункцыянальны, аксіялагічны, сацыялагічны, менеджарскі. Індуктыўны і дэдуктыўны падыходы да вывучэння сутнасці бібліятэчнай прафесіі. Інтэрпрэтацыі сутнасці бібліятэчнай прафесіі. Узроўні разумення бібліятэчнай прафесіі. Дыскурсы будучыні бібліятэчнай прафесіі.

Праблемнае поле сучаснай бібліятэчнай прафесіялогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 2. Гістарычныя змены зместу і форм бібліятэчнай дзейнасці як прафесіі*

Эвалюцыя поглядаў на бібліятэчную прафесію са старажытных часоў да сучаснасці: зараджэнне бібліятэчнай прафесіі ў антычнасці, сярэдневяковыя манахі-кнігаахоўнікі, бібліятэкар як ганаровае званне і пасада ў XIII–XIX стст., масавасць бібліятэчнай прафесіі ў XX ст., бібліятэкар як праваднік у інфармацыйнай прасторы ў XXI ст. Гендарныя і ўзроставыя аспекты бібліятэчна-інфармацыйнай сферы на працягу стагоддзяў.

Заснаванне першага прафесійнага аб'яднання бібліятэкараў – Амерыканскай бібліятэчнай асацыяцыі. Стварэнне «Таварыства бібліятэказнаўства»ў Расіі. Гісторыя і сучасная дзейнасць Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі.

Статус бібліятэкі і бібліятэчнай прафесіі ў сучасным грамадстве. Сучасная кадравая палітыка ў бібліятэчнай сферы. Сучаснае заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адносінах да спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы (Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры, Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь і інш.).

### *Тэма 3. Характарыстыкі прафесійнай дзейнасці сучаснага спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы*

Бібліятэчна-інфармацыйныя спецыялісты як сацыяльна-прафесійная група. Сацыяльна абумоўленая накіраванасць бібліятэчнай прафесіі. Калектыўны характар бібліятэчнай дзейнасці. Творчая прырода працы бібліятэкара.Фізіялагічныя асаблівасці бібліятэчнай працы.

Поліфункцыянальнасць прафесійнай дзейнасці спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы.Навуковая класіфікацыя відаў бібліятэчнай дзейнасці. Асноўныя групы бібліятэчных кадраў. Прафесійная міграцыя і мабільнасць спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы.

Прафесіяграма сучаснага бібліятэкара (змест дзейнасці, асноўныя вырашаемыя задачы, прафесійна важныя якасці, захворванні, проціпаказаныя для прафесіі, абавязкі). Залежнасць зместу дзейнасці і прафесійных абавязкаў бібліятэкара ад кантынгенту чытачоў, складу фондаў, тэхналагічнага забеспячэння працэсаў. Змест і формы дзейнасці бібліятэчна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйных спецыялістаў у асноўных падраздзяленнях бібліятэкі.

Уплыў інфарматызацыі і тэхналагізацыі на прафесійную дзейнасць спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы.

### *Тэма 4. Прафесійныя патрабаванні да асобы сучаснага спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы*

Сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці прафесійнай дзейнасці бібліятэкара. Сацыяльна абумоўленая накіраванасць асобы бібліятэкара.

Агульнапрафесійныя патрабаванні да асобы бібліятэкара. Прафесійныя каштоўнасці сучаснага бібліятэкара. Прафесійная свядомасць бібліятэкара. Праблема вобраза свету бібліятэкара. Псіхаграма спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы.

Сутнасць прафесійнай этыкі бібліятэкара. Этыка зносін у бібліятэцы. Рыторыка бібліятэкара. Этыка слухання. Бібліятэчны этыкет. Нормы бібліятэчнай этыкі (вольны доступ да інфармацыі, недапушчальнасць цэнзуры ў бібліятэцы, канфідэнцыяльнасць чытання, прыярытэтнае абслугоўванне). Заканадаўчыя падставы прафесійнай этыкі бібліятэкара.

Інфармацыйная, псіхолага-педагагічная і экалагічная культура сучаснага спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы.

### *Тэма 5. Прафесіяналізацыя спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы*

Станаўленне і развіццё бібліятэчнай адукацыі. Выдатныя дзеячы ў галіне бібліятэчнай адукацыі – Л. Б. Хаўкіна, І. Б. Сіманоўскі, В. Е. Лявончыкаў і інш. Сістэма падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў у Рэспубліцы Беларусь. Арганізацыя сістэмы бесперапыннай адукацыі ў бібліятэках.

Сусветны вопыт фарміравання кампетэнцый спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы. Паняцце «кампетэнцыя». Сутнасць, змест і формы рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы. Дзяржаўны адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь першай ступені па спецыяльнасці «бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць».

Напрамкі фарміравання бібліятэчнага спецыяліста сродкамі прафесійнага друку, удзелу ў рабоце прафесійных аб'яднанняў, у канферэнцыях, стажыроўках, конкурсах прафесійнага май-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стэрства і інш. Прафесійнае развіццё і самаадукацыя бібліятэкара.

Адаптацыя бібліятэкара ў прафесійным асяроддзі: этапы і іх характарыстыка. Этапы прафесійнага станаўлення бібліятэкара, крызы прафесіяналізацыі, прафесійныя дэфармацыі, сіндром прафесійнага выгарання.

### *Тэма 6. Навукова-метадычнае забеспячэнне прыкладной прафесіялогіі*

Перыядызацыя развіцця чалавека як суб’екта працы. Прыёмы аналізу прафесійнай дзейнасці. Узроўні прафесіяналізму. Прафесійная кампетэнтнасць спецыяліста. Матывацыйная сфера прафесіяналізму. Аперацыянальная сфера прафесіяналізму. Крытэрыі ацэнкі ўзроўню прафесіяналізму.

Прафесіяграфія як спецыяльная тэхналогія вывучэння прафесійнай дзейнасці.Інфармацыйная прафесіяграфія, дыягнастычная прафесіяграфія, фарміруючая прафесіяграфія, карэкцыйная прафесіяграфія: мэты і асаблівасці.

Метады прафесіяграфіі. Прафесіяграфаванне, мадэляванне, комплексная методыка «сацыяльны партрэт прафесіянала», комплексная методыка «вобраз свету прафесіянала». Прафесіяграма: сутнасць, тэхналогія распрацоўкі. Асаблівасці распрацоўкі псіхаграмы. Тэхналогія аналізу прафесійнай кампетэнтнасці спецыялістаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ (дзённая форма атрымання адукацыі)

| Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | практычныя і семінарскія заняткі | | |
| **Уводзіны** | 1 | – | – | |
| *Тэма 1.* Бібліятэчная прафесіялогія як навука і вучэбная дысцыпліна | 1 | 2 | 2 | тэст |
| *Тэма 2.* Гістарычныя змены зместу і форм бібліятэчнай дзейнасці як прафесіі | 2 | 2 | 2 | вуснае апытанне |
| *Тэма 3.* Характарыстыкі прафесійнай дзейнасці сучаснага спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы | 2 | 2 | 2 | вуснае апытанне |
| *Тэма 4*. Прафесійныя патрабаванні да асобы спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы | 2 | 2 | – | эсэ |
| *Тэма 5*. Прафесіяналізацыя спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы | 2 | 4 | – | вуснае апытанне |
| *Тэма 6.* Навукова-метадычнае забеспячэнне прыкладной прафесіялогіі | 2 | 4 | – | тэрмінал. слоўнік |
| **Усяго…** | **12** | **16** | **6** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ (завочная форма атрымання адукацыі)

| Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|
| | лекцыі | практычныя і семінарскія заняткі |
| **Уводзіны** | 1 | |
| *Тэма 1.* Бібліятэчная прафесіялогія як навука і вучэбная дысцыпліна | 1 | |
| *Тэма 2.* Характарыстыкі прафесійнай дзейнасці і прафесійныя патрабаванні да асобы сучаснага спецыяліста бібліятэчна-інфармацыйнай сферы | 2 | 2 |
| *Тэма 3.* Навукова-метадычнае забеспячэнне прыкладной прафесіялогіі | 2 | 2 |
| **Усяго…** | **6** | **4** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1.* Библиотекарь: выбор профессии: мастер-класс профессора Ю. Н. Столярова / ред.-сост. Ю. Н. Столяров.– М. : Либерея-Бибинформ, 2010. – 175 с.

*2. Галковская, Ю. Н.* Современные требования к профессии библиотекаря-библиографа: исследования и тенденции / Ю. Н. Галковская // Матэрыялы Міжнароднага кангрэса «500 гадоў беларускага кнігадрукавання» : XIII Міжнар. кнігазнаўч. чыт., Мінск, 14–15 верас. 2017 г. : у 2 ч. / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 2017. – Ч. 2. – С. 131–135.

*3. Елфимова, Л. В.* Развитие библиотечной профессиологии как научной и учебной дисциплины / Л. В. Елфимова // Культурная жизнь Юга России. – 2012. – № 2. – С. 98–100. – Вариант в Интернете: https://elibrary.ru/ item.asp?id=17783056.

*4. Зазерский, Е. Я.* На путях научного познания библиотечной профессии/ Е.Я. Зазерский, А.В. Соколов //Советское библиотековедение. – 1990. – №4. – С.60–67.

*5. Клименкова, Н. В.* Трансформация профессии библиотекаря в информационном обществе / Н. В. Клименкова // Бібліятэчная адукацыя: традыцыі і навацыі : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., 23 кастр. 2014 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, фак. інфарм.-дакум. камунікацый. – Мінск, 2015. – С. 43–48.

*6. Лопатина, Н. В.* Библиотечный специалист в профессиональной структуре информационного общества / Н. В. Лопатина // Вестн. Моск. гос. ун-та культуры и искусств.– 2014. –№ 1. – С.160–167.

*7. Паўлава, С. А.* Некаторыя аспекты вывучэння бібліятэчнай прафесіі і перспектывы яе развіцця / С. А. Паўлава // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры. – 2004. – № 3. – С. 108–112.

*8.* Справочникбиблиотекаря / под ред. А. Н. Ванеева, В. А. Минкиной. – 3-е изд., испр. и доп. – СПб. : Профессия, 2005. – С. 403–470.

*9. Соколов, А. В.*Библиотечная профессиология: некоторые итоги XX века / А. В. Соколов // Библиотековедение. – 2003. – № 5. – С. 22–35.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*10. Соколов, А. В.*Библиотечная профессиология в системе библиотековедческих наук / А. В. Соколов // Библиотековедение. – 2003. – № 4. – С. 29–33.

*11. Чачко, А. С.* Библиотечная профессия: проблемы и их отражение в исследованиях / А. С. Чачко // Российское библиотековедение: XX век: направления развития, проблемы и итоги / Рос.гос. б-ка ; сост. и предисл. Ю. П. Мелентьева ; науч. ред. Л. М. Инькова. – М. : ФАИР-ПРЕСС : Пашков дом, 2003. – С. 224–247.

*12. Яцэвіч, М. А.* Вышэйшая бібліятэчная адукацыя ў Беларусі: стан і шляхі трансфармацыі / М. А. Яцэвіч // Бібліятэчная адукацыя: традыцыі і навацыі : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., 23 кастр. 2014 г./ Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, фак. інфарм.-дакум. камунікацый. – Мінск, 2015. – С. 5–11.

*Дадатковая*

*1. Алтухова, Г. А.* Профессиональная этика библиотекаря : учеб.пособие / Г.А. Алтухова ; Моск. гос. ун-т культуры и искусств. – М. :Изд-во МГУКИ : Профиздат, 2000. – 103 с.

*2. Бочарникова, Е. С.* Профессиональное развитие библиотечныхспециалистов / Е.С. Бочарникова // Научные и технические библиотеки. –2006. – № 6. – С. 41–45.

*3.* Великие люди – библиотекари: от А до Я / сост. Е. И. Полтавская. – М. : Шк. б-ка, 2005. – 158 с.

*4.* Всемирнаяистория развития библиотечной профессии [Электронный ресурс] // КиберПедия : информ. ресурс. – Режим доступа: https://cyberpedia.su/5x9a49.html. – Дата доступа: 16.07.2019.

*5. Галковская, Ю. Н.* Перспективные направления обновления содержания образования по специальности «библиотечно-информационная деятельность» / Ю. Н. Галковская // Весн. Беларус. дзярж.ун-та культуры і мастацтваў. – 2019. – № 2 (32). – С. 129–136.

*6. Дзямешка, Л. А.* Заснаванне і станаўленне вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь / Л. А. Дзямешка, С. В. Зыгмантовіч // Весн. адукацыі. – 2009. – № 11. – С. 65–73.

*7. Дзямешка, Л. А.*Статус бібліятэкара ў грамадстве / Л. А. Дзямешка, С. А. Паўлава // XI Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвеч. Дням славянскага пісьменства

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і культуры (Мінск, 24–26 мая 2005 г.) : матэрыялы чыт. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2006. – С. 48–54.

*8. Езова, С. А.* Личность специалиста: главные составляющие / С. А. Езова // Библиотечное дело. – 2006. – № 6. – С. 9–10.

*9. Елепов, Б. С.* Компетентность и компетенции библиотечного специалиста: как и зачем их оценивать / Б. С. Елепов, Е. М. Крючкова // Библиотековедение. – 2009. – № 3. – С. 117–124.

*10. Жукова, Т. Д.* Профессиональное сознание библиотекаря:теоретический анализ проблемы / Т.Д. Жукова // Шк. б-ка. – 2007. – № 4. – С. 17–26.

*11. Замаева, Н. Н.*Кадровая политика библиотечной отрасли в Республике Беларусь / Н. Н. Замаева // Бібл. весн.,2014. – Вып. 6. – С. 45–48.

*12. Козленко, Е. Ю.* Художественная литература в ракурсе профессиональной самоидентификации библиотекаря / Е. Козленко // Бібл. свет. – 2016. – № 2. – С. 28–30.

*13. Леонов, В. П.* Библиотечная профессия в контексте двух культур: между Гутенбергом и Интернетом [Электронный ресурс] / В. П. Леонов// Библиотечная профессия в зеркале информационного общества. – Режим доступа: http://www.library.ru/1/sociolog/text/article.php?a_uid=59. – Дата доступа: 16.07.2019.

*14. Лопатина, Н. В.* Библиотечная профессия в информационномобществе: разрушение или развитие / Н. В. Лопатина // Научно-техническая информация. Сер.2. – 2014. – №5. – С. 19–23.

*15. Матвеев, М. Ю.* Философские идеи XX века и их влияние на имидж библиотек / М. Ю. Матвеев // Библиотековедение. – 2008. – № 1. – С. 114–119.

*16. Павлова, С. А.* Профессиография библиотекаря отдела обслуживания:текст лекции / С. А. Павлова. – Минск: Белорус.ин-т культуры, 1991. – 24 с.

*17. Пераверзева, Ю. А.* Праблема самарэалізацыі спецыяліста ў бібліятэчнай справе / Ю. А. Пераверзева // Весн. Беларус. дзярж.ун-та культуры і мастацтваў. – 2014. – № 1 (21). – С. 126–132.

*18. Переверзева, Ю. А.* Профессиональное развитие библиотекаря-библиографа в условиях библиотеки как самообучающейся организации / Ю. А. Переверзева // Культура: открытый формат – 2013 (библиотековедение, библиографоведение и

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

книговедение, искусствоведение, культурология, музееведение, социокультурная деятельность) : сб. науч. ст. / Белорус.гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2013. – С. 446–450.

*19. Соколов, А. В.* Библиотечная мифология: вчера, сегодня, завтра /А. В.Соколов // Библиотековедение. – 2006. – № 1. – С. 112–118.

*20. Соколов, А. В.*Науки об информации и библиотекарь: проф.-мировоззрен. пособие / А.В. Соколов. – М. : Литера,2010. – 143 с.

*21. Степанов, В. К.* Библиотека и библиотекари в ближайшие двадцать лет, или В ожидании сингулярности / В. К. Степанов // Научные и технические библиотеки. – 2018. – № 1. – С. 19–31.

*22. Степанов, В. К.* Библиотекарь эпохи цифры: что должен уметь и знать? / В. К. Степанов // Совр.б-ка. – 2014. – № 10. – С. 22–25.

*23. Сукиасян, Э. Р.* Библиотечная профессия. Кадры. Непрерывное образование : сб. ст. и докл. / Э. Р. Сукиасян. – М. : ФАИР-ПРЕСС, 2003. – 447 с.

*24. Сукиасян, Э. Р.* Библиотечная профессия и кадровый менеджмент: избр. ст. 2004–2011 гг. / Э.Р. Сукиасян. – СПб. : Профессия, 2011. – 430 с.

*25. Сукиасян, Э. Р.* Нашей профессии – 140 лет / Э. Р. Сукиасян // Научные и технические библиотеки. – 2016. – № 7. – С. 42–48.

*26. Сукиасян, Э. Р.* Профессиональная культура современного библиотекаря / Э. Р. Сукиасян // Вест. Библ. Ассамблеи Евразии. – 2018. – № 3. – С. 69–73.

*27. Сукиасян, Э. Р.* Профессиональное самообразование / Э. Р. Сукиасян // Научные и технические библиотеки. – 2010. – № 1. – С. 68–73.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныяпедагагічныя тэхналогіі і метады выкладання

З ліку эфектыўных педагагічных метадаў і тэхналогій навучання, якія садзейнічаюць набыццю магістрантамі тэарэтычных і метадычных ведаў у бібліятэчнай прафесіялогіі і фарміраванню ў іх вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, вылучаюцца наступныя:

– праектныя тэхналогіі;

– тэхналогія праблемнага навучання (праблемнае выкладанне, частковапошукавы метад), якая рэалізуецца на лекцыйных занятках;

– тэхналогія навучання як вучэбнага даследавання, якая рэалізуецца на практычных занятках і пры самастойнай рабоце магістранта;

– камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусія, спрэчка-дыялог і інш.);

– гульнявыя тэхналогіі;

– пошукава-эўрыстычныя метады (аналіз дакументаў і нарматыўных прававых актаў, аналіз сітуацый);

– метады самастойнай работы магістрантаў (работа з першакрыніцамі, напісанне эсэ, рэфератаў, падрыхтоўка партфоліа і інш.);

– кантрольна-ацэначныя метады (адказы на семінарах, тэставыя заданні).

Рэкамендаваныя педагагічныя тэхналогіі і метады выкладання накіраваны на глыбокую рэфлексію магістрантамі матэрыялаў дысцыпліны па выбары, стымуляцыю іх асобаснага і прафесійнага развіцця.

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці магістрантаў

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавую сістэму ацэнкі вучэбна-пазнавальнай і даследчай дзейнасці магістрантаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для ацэнкі дасягненняў магістрантаў па дысцыпліне па выбарыі дыягностыкі ўзроўню засваення ведаў і ўменняў рэкамендаваны наступны інструментарый:

– тэставы кантроль па дысцыпліне ў цэлым і па асобных тэмах;

– падрыхтоўка эсэ і рэфератаў па асобных тэмах дысцыпліны;

– вуснае апытанне і маніторынг засваення бягучых матэрыялаў падчас лекцый;

– абарона заданняў, выкананых на практычных занятках;

– абарона выкананых у рамках кіруемай самастойнай работы індывідуальных (групавых) заданняў;

– праверка падрыхтаваных прадуктаў (тлумачальны слоўнік, тэст);

– залік – для выніковай дыягностыкі кампетэнцыі магістранта па дысцыпліне.

Ацэнка вучэбных дасягненняў магістрантаў ажыццяўляецца з улікам актыўнасці работы на лекцыйных, практычных занятках, а таксама з улікам дасягненняў кіруемай самастойнай работы. Для вымярэння ступені адпаведнасці вучэбных дасягненняў магістранта патрабаванням адукацыйнага стандарту рэкамендуецца выкарыстоўваць праблемныя, творчыя заданні, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы магістрантамі

Мэта самастойнай работы магістрантаў – засваенне ў неабходным аб'ёме зместу дысцыпліны па выбарыпраз сістэматызацыю, планаванне і самакантроль асабістай вучэбнай дзейнасці.

Па вучэбнай дысцыпліне распрацоўваецца вучэбна-метадычны комплекс з матэрыяламі і рэкамендацыямі ў дапамогу арганізацыі самастойнай работы магістрантаў. У мэтах ацэнкі якасці самастойнай работы магістрантаў здзяйсняецца кантроль за яе выкананнем.

З улікам мэты, задач і зместу вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчная прафесіялогія» мэтазгодна выкарыстоўваць наступныя віды самастойнай работы магістрантаў:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– вывучэнне канспекта лекцый;

– работа магістрантаў з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай, даведачнымі выданнямі, самастойнае вывучэнне магістрантамі асобных пытанняў дысцыпліны, складанне тэрміналагічнага слоўніка і тэстаў па асобных тэмах дысцыпліны па выбары;

– кантралюемая самастойная работа ў выглядзе выканання індывідуальных заданняў у аўдыторыі падчас правядзення практычных заняткаў пад кантролем выкладчыка;

– кіруемая самастойная работа, у тым ліку ў выглядзе выканання індывідуальных заданняў з кансультацыямі выкладчыка, пісьмовых адказаў на тэсты;

– падрыхтоўка эсэ і рэфератаў па індывідуальных тэмах;

– падрыхтоўка да апытанняў, тэстаў, заліку.

Выкананая работа павінна адлюстроўваць ступень засваення магістрантам асноўных тэарэтычных пытанняў, уменне самастойна мысліць, абагульняць матэрыял, вызначаць праблемы, рабіць высновы.

Для дасягненння выразнасці і структураванасці работы магістрант павінен фіксаваць выкананне самастойных заданняў і афармляць запісы ў рабочых сшытках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**БІБЛІЯТЭЧНАЯ ПРАФЕСІЯЛОГІЯ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па спецыяльнасці II ступені вышэйшай адукацыі*
*1-23 80 01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць.*
*Прафілізацыя: Тэорыя і методыка навукова-даследчай*
*і аналітычнай дзейнасці*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2021. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум.друк. арк. 1,16. Ул.-выд. арк. 0,73. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ